**Малахава І.А.,** *выкладчык*

# МАСТАЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК СРОДАК ТВОРЧАГА РАЗВІЦЦЯ АСОБЫ

У творчым развіцці і самарэалізацыі кожнай асобы значная роля належыць мастацкай дзейнасці ў розных яе відах і жанрах. Назапашаныя факты, назіранні даследчыкаў, даныя, атрыманыя вучонымі розных краін, дазваляюць лічыць, што мастацкая дзейнасць дзіцяці, дабратворна адбіваецца на развіцці інтэлектуальных і творчых здольнасцей. Значыць, далучэнне да мастацтва неабходна не само па сабе, а ў якасці перадумовы аднаго з магутнейшых сродкаў уздзеяння на станаўленне асобы.

Працэс мастацкага выхавання ўяўляе сабой збалансаванае спалучэнне трох асноўных відаў мастацкай дзейнасці - знаёмства з мастацкімі творамі (спажыванне мастацтва), набыцця мастацказнаўчых ведаў і непасрэдна мастацкай творчасці. У вызначаным кантэксце пад мастацкай дзейнасцю мы разумеем асобую форму творчай, прадуктыўнай дзейнасці па законах прыгажосці ў розных відах мастацтва, якая адказвае патрабаванням эстэтычнага выхавання і адукацыі і ў канчатковым выніку накіравана на выхаванне гарманічнай асобы. Удзел дзіцяці ў мастацкай дзейнасці прадугледжвае развіццё актыўнасці,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самастойнасці мыслення, уяўлення, выхаванне эмацыянальнай і валявой сферы ў працэсе зносін з мастацтвам. Набыццё ведаў, развіццё уменняў і навыкаў у галіне мастацкай дзейнасці ажыццяўляецца з улікам фарміравання патрэбнасці і праяўлення здольнасці самастойна вырашаць творчыя задачы, што актывізуе крэатыўны патэнцыял асобы.

Такім чынам, вынікі зносін чалавека з мастацтвам можна разглядаць не толькі як крыніцу абуджэння здольнасці ўспрымаць і ствараць прыгожае, але і глыбей: мастацтва можна трактаваць як сродак развіцця не толькі спецыфічнай, але і універсальнай творчай здольнасці, якая можа быць выкарыстана ў любой сферы чалавечай дзейнасці і пазнання - у навуцы, у палітыцы, у побыце і г. д. Усё гэта дазваляе меркаваць аб існаванні магчымасці пераносу творчых здольнасцей з аднаго віду дзейнасці на другі. Падобная магчымасць (пераносіць веды і уменні ў новую сітуацыю) дазваляе акцэнтаваць увагу педагогаў на пераважным развіцці выяўленых творчых якасцей асобы ў той ці іншай дзейнасці. Так, веды і навыкі, набытыя ў працэсе мастацкай творчасці, чалавек можа пераносіць у працоўную, вучэбную, сацыяльную дзейнасць, сферу быту і зносін.

Значыць, далучэнне дзяцей да мастацтва будзе стымуляваць развіццё ўсіх здольнасцей у поўнай меры, таму што мастацкая дзейнасць выступае, з аднаго боку, як сродак актывізацыі і ўмацавання ўласцівасцей і здольнасцей, неабходных у другіх відах дзейнасці, з мастацтвам не звязаных, з другога - як спецыфічная форма пазнання рэчаіснасці, неад'емная частка мастацкай культуры, без авалодання якой немагчыма плённае развіццё асобы (як агульнае, так і спецыяльнае). Паколькі мастацтва - своеасаблівая мадэль чалавечай культуры, канцэнтраванае выяўленне ідэалу эпохі, пастолькі далучэнне да мастацкіх каштоўнасцей садзейнічае развіццю патрэбнасці ў актыўнай дзейнасці па законах прыгажосці. Гэта патрэбнасць у практычным дзеянні найбольш поўна рэалізуецца ў мастацкай творчай дзейнасці галоўным чынам таму, што ў працэсе апошняй:

а) развіваецца крэатыўнасць як агульная універсальная



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здольнасць да творчасці, неабходная для паспяховай рэалізацыі кожнай прадуктыўнай дзейнасці;

б) уяўляецца сутнасць працэсу стварэння мастацкага твора, яго глыбінных ідэй;

в)павышаецца ўзровень духоўнай культуры асобы;

г) удасканальваюцца маральна-эстэтыч-ныя якасці асобы ў выніку зносін з шэдэўрамі сусветнага мастацтва;

д)больш эфектыўна і плённа ажыццяўляецца працэс самаразвіцця, самавыхавання і самаактуалізацыі асобы дзіцяці. Таму чым раней дзіця зможа ўдзельнічаць у мастацкай дзейнасці розных відаў і жанраў, тым больш якасна будуць развівацца яго творчыя здольнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ